turn of the XX - XXI century. This work lies in the fact that the research was made on the maximum number of sources on the history of the Markov Monastery

Ключавыя словы: Маркаў манастыр, праваслаўе, архітэктура, час заняпаду, аднаўленне

Здаўна важнымі духоўнымі цэнтрамі на нашых землях з'яўляліся манастыры. Адзін з гэтых манастыроў – Віцебскі Маркаў Свята-Троіцкі. Гістарычны лёс манастыра няпросты. Ён зведаў часы росквіту і заняпаду, разбурэння і адраджэння.

Спрэчнай застаецца праблема часу і абставін заснавання манастыра. На падставе вывучаных крыніц, мы вызначылі, што заснаванне манастыра можа быць аднесена і да кан. XIII ст. З ўпэўненасцю можам сцвярджаць пра існаванне ў 70-я гг. XVI ст. маркаўскага прыходу (пратапопіі), але не манастыра.

Аднак асноўнымі датамі, звязанымі з заснаваннем манастыра з'яўляюцца 1633 г. і 1642 г. У выніку даследвання мы прыйшлі да высновы, што 1633 г., калі Леў Самуіл Агінскі, цівун троцкі, і пан Севасцьян Мірскі, суддзя земскі браслаўскі, на падставе атрыманага раней ад Жыгімонта III прывілея, пабудавалі драўляную царкву і жылыя пабудовы для манахаў, і з'яўляецца датай заснавання манастыра. У 1642 г. Львом Самуілам Багданавічам Агінскім з жонкаю Соф'яй Янаўнай з Бялевічаў замацавалі за Маркавым манастыром землі, набытыя Агінскімі ў пана Яна Кіселя Загаранскага і пана Марціна Шыдлоўскага.

Крытычнай датай у гісторыі абіцелі стаў 1751, калі востра стаяла пытанне змены канфесійнай прыналежнасці. Нам вядома, што сын фундатара Маркава манастыра Льва Самуіла Агінскага князь Сімяон Караль Агінскі перайшоў у каталіцтва. Тым не менш, у 1687 г. ён спецыяльнай граматай пацвердзіў правы манастыра на атрыманыя маёнткі, прычым у дакуменце падкрэсліваецца, што ў выпадку адыходу кіраўніцтва манастыра "ад релеи нашей старожитной греческой" (г. зн. праваслаўя) ва ўніяцтва ці каталіцтва, манастыр цалкам пазбавіўся б падтрымкі фундатара, дзякуючы гэтаму манастыр заставаўся праваслаўным. Аднак трэба адзначыць, што спробы перавесці манастыр ва ўніяцтва былі.

Манастыр перажыў цяжкія часы, звызаныя з уварваннем французаў у 1812 г. Час Савецкай улады – перыяд поўнага разбурэння Маркава манастыра. У 1918 г. манастыр быў зачынены, у 1919 на яго месцы пачаў дзейнічаць канцэнтрацыйны лагер. Затым былі гады акупацыі у перыяд Вялікай Айчыннай вайны (які амаль што не апісваецца у крыніцах), аднак богаслужэнне было адноўлена. Былі гады забыцця і запусцення.

Маркаў манастыр за час свайго існавання амаль заўсёды валодаў зямлёй, шэрагам вёсак і юрыдык у Віцебску. У XVII ст. манастыру належалі землі набытыя Агінскімі ў пана Яна Кіселя Загаранскага і пана Марціна Шыдлоўскага. У сяр. XIX ст. пры ім знаходзілася мельніца Прудок. У савецкі час гэта палажэнне змянілася. Землі манастыра ў сучасны час шчыльна забудаваны карпусамі ААТ "Віцебскі камбінат шаўковых тканін".

Старажытныя цэркві манастыра былі сапраўднымі архітэктурнымі шэдэўрамі свайго часу. Манастырскі комплекс на пачатку XX ст. складаўся з Свята-Троіцкай, Свята-Пакроўскай (каля 1752), Свята-Мікалаеўскай (1730), Свята-Параскеўскай цэркваў (у фальварку Шыдлоўшчына, каля 1730), званіцы-брамы, дома ігумена, брацкага дома, шэрагу гаспадарчых пабудоў. Асабліва вызначалася драўляная Свята-Троіцкая царква, пабудаваная ў лепшых традыцыях праваслаўнай архітэктуры. Ад усяго шматлікага манастырскага двара захавалася да нашага часу толькі Свята-Казанская царква.

Сваё новае нараджэнне манастыр атрымаў у к. XX в.: 23 лістапада 2000 г. ён быў адноўлены ў мяжы прыхода Свята-Казанскай царквы. У наш час робяцца спробы па аднаўленню першапачатковага гістарычнага вобліка Свята-Казанскай царквы і ўсяго манастыра.

© БГУФК

ОСОБЕННОСТИ ОСУЩЕСТВЛЕНИЯ КУЛЬТУРНО-ЭКОЛОГИЧЕСКОГО ТУРИЗМА НА ПРИМЕРЕ ПОХОДА ПО МАРШРУТУ «МИНСК-ПУСТЫНКИ-МИНСК»

Е.А. РУТКОВСКИЙ, *И.В. ФИЛИПОВИЧ*

The work is dedicated to the description of features of development and realization of a route of ecological tourism on the basis of being restored objects of a cultural heritage of Belarus. Authors offer a number of actions to attract our attention to disappearing monuments of architecture within backpackings

Ключевые слова: культурно-экологический туризм, экологические акции, историко-культурное наследие, маршрут туристического похода

Данный проект – создание культурно-экологической программы, направленной на вовлечение туристов в процесс сохранения и восстановления историко-культурного наследия Республики Беларусь.

Проектом предусмотрена разработка туристического маршрута с посещением историко-культурных объектов, находящихся в заброшенном состоянии и нуждающихся в восстановлении.

Разработанный туристический маршрут – это маршрут, логично сочетающий природно-рекреационные ресурсы с аттрактивными объектами культурного наследия. Маршрутом предусмотрено посещение объекта историко-культурного наследия – монастырь Успения Пресвятой Богородицы, находящегося в неудовлетворительном состоянии и нуждающегося в восстановлении. Территория монастыря содержит: величественные храмы и маленькие церквушки, колокольню, монастырскую школу и комплекс хозяйственных построек. История монастыря начинается с XIV века, а его основание изложено в легенде [1]. Сейчас монастырь нуждается в помощи по восстановлению и сохранению.

Основная концепция, использованная при формировании нового турпродукта – это возрождение былого величия храмовой архитектуры Беларуси, путем привлечения туристов к участию в различного рода восстановительных и охранных мероприятиях, организации экологических акций в рамках волонтерского движения.

Волонтерское движение – это движение, организованное туристическими клубами и правительственными организациями, ведающими вопросами охраны природы для безвозмездной деятельности, направленной на защиту окружающей среды и творений человеческих рук, нуждающихся в помощи [2].

Наше исследование показало, что неравнодушные туристы из числа молодежи готовы участвовать в некоммерческом туризме, основанном на активных мероприятиях по возрождению уходящей хрупкой красоты старинной архитектуры. С этой целью был разработан и внедрен проект «Хрупкая Беларусь», имеющий целью вовлечение студентов специальности «Туризм и гостеприимство» к знакомству с историко-культурным наследием, при непосредственном соприкосновении с ним и оказании помощи в его восстановлении и сохранении окружающей его природы.

Культурно-экологический туризм – результат содействия государственной власти, туристических предприятий и населения в целом. Возрождение интереса к региональным культурно-историческим объектам через волонтерское движение молодежи, будет способствовать не только устойчивому развитию туризма, но и сохранению природной и культурной среды.

Литература

1. *Чантурия, В.* История архитектуры Беларуси / В. Чантурия. – Минск: Вышейшая школа, 1985.
2. *Штефан, Л.* Экологический туризм / Л. Штефан. – Минск: БГУФК, 2010.

©ГДУ імя Ф. Скарыны

З ГІСТОРЫІ ВЫВУЧЭННЯ БАЛАДНАГА ЖАНРУ: КЛАСІФІКАЦЫІ СЮЖЭТАЎ БАЛАДНЫХ ПЕСЕНЬ

***А.П. САЎЧАНКА*, В.С. НОВАК**

In this article the problem of studying the classification of subjects of folk ballads. Are listed and described in the text of the article, a variety of approaches to learning, as well as the proposed classification of subjects of folk ballads

Ключавыя словы: сюжэтная класіфікацыя, сюжэт, народныя балады

Баладныя песні заслугоўваюць пільнай увагі даследчыкаў, бо прываблiваюць багаццем народнага вопыту, закладзенага ў іх змесце, а таксама глыбінёй адлюстравання ўнутранага свету герояў, мастацкай дасканаласцю арганізацыі сюжэта. Народныя балады з'яўляюцца самабытнай фальклорнай спадчынай, у якой добра захаваліся рысы і прыметы старажытных часоў і якая ўяўляе сабой удалы эмпірычны матэрыял для высвятлення пытанняў генезісу гэтага жанру, яго сувязі і ўзаемадзеяння з іншымі жанрамі.

Галоўнай асаблівасцю эпічнасці баладных тэкстаў з'яўляецца наяўнасць сюжэта. Сюжэт яднае балады з іншымі эпічнымі жанрамі – былічкамі і казкамі, але баладныя сюжэты валодаюць жанравай адметнасцю. Калі разглядаць былічкі і казкі, то яны характарызуюцца наяўнасцю састаўных элементаў сюжэта (завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя і развязка), якія прадстаўлены ў самім творы, але ў баладах, як правіла, мы можам сустрэць толькі кульмінацыйны момант і далейшае развіццё дзеяння. Мы не ведаем, напрыклад, як складваліся ўзаемаадносіны нявесткі і свякрухі ў баладзе «Ды паехаў мілы ў вялікую дарогу». У баладных творах размова ідзе аб выніках пэўных падзей, якія адбыліся да пачатку апавядання. Гэта робіць паэтычны змест балад цікавым, таемным, напружаным, а таксама ўзмацняе драматычны пачатак і абумоўлівае своеасаблівасць кампазіцыйнай будовы.

Баладныя тэксты з'яўляюцца малаэпізадычнымі, але часам і аднаэпізадычнымі. Гэта лёгка патлумачыць: балады акцэнтуюць сваю ўвагу на самым галоўным з пункту гледжання жанру – на адной ці некалькіх падзеях, якія дасягнулі напружання і завяршаюцца шэрагам папярэдніх падзей, аб якіх няма размовы ў баладзе. Такая акалічнасць дае падставы для разумення, чаму балады па аб'ёме значна мен-